**12 ліпеня 2026 г. - 60 гадоў з дня нараджэння Таццяны Паўлаўны Дземідзюк (1966), Ганаровага грамадзяніна Кобрынскага раёна, старшыні СВК «Узыходзячая зара»**



Дземідзюк Таццяна Паўлаўна нарадзілася 12 ліпеня 1966 года ў в. Хідры Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Усе яе продкі – працаўнікі сяла. Тут, у калгасе «Зара», з моманту яго заснавання, працавалі абедзве бабулі Таццяны Паўлаўны, затым бацька і маці.

Кошт сялянскай працы Таццяна ведала з дзяцінства. Бацькі былі для дзяўчынкі прыкладам, яна памятала іх наказ: «Зямля, як жывая істота, якой патрэбны догляд і ўвага. Будзеш укладваць сілы ў зямлю – яна абавязкова аддзякуе». Невыпадкова пасля заканчэння Хідрынскай сярэдняй школы Таццяна пайшла вучыцца ў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава. У 1987 годзе закончыла інстытут па спецыяльнасці «Планаванне сельскай гаспадаркі».

Увесь працоўны шлях Таццяны Дземідзюк звязаны з сельскагаспадарчай вытворчасцю. Сваю працоўную дзейнасць пачала ў 1986 годзе эканамістам калгаса «Дружба» Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Затым працавала эканамістам калгаса «Зара» Кобрынскага раёна, які ў далейшым перайменаваны ў СВК «Узыходзячая зара». Працавала намеснікам старшыні, выконвала абавязкі старшыні кааператыва. Вялікую ролю ў станаўленні Т. П. Дземідзюк як спецыяліста адыгралі тагачасныя старшыня гаспадаркі Іван Іванавіч Тарасюк і яго намеснік Зоя Уладзіміраўна Дубінка. Аб выдатнай рабоце гэтых знакамітых людзей, заслужаных работніках сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, іх выключных чалавечых і маральна-дзелавых якасцях ведала ўся краіна.

Са жніўня 2010 года Т. П. Дземідзюк назначана на пасаду старшыні СВК «Узыходзячая зара». Высокі прафесіяналізм, адказнасць, ініцыятыва і настойлівасць у вырашэнні вытворчых пытанняў, прынцыповасць, дзелавітасць, новыя падыходы дазваляюць Таццяне Паўлаўне дабівацца значнага ўмацавання эканомікі гаспадаркі, павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, росту прадукцыйнасці жывёлагадоўлі.

За гэты перыяд гаспадарка дасягнула вялікіх вынікаў. У 2013 годзе за дасягнутыя высокія паказчыкі ў сацыяльна-эканамічным развіцці СВК «Узыходзячая зара» ўзнагароджаны дыпломам III ступені, які быў заваяваны ў спаборніцтве сярод арганізацый АПК Брэсцкай вобласці. Гаспадарка займае другую пазіцыю ў вобласці па паказчыках надояў малака. У 2023 годзе ад каровы тут атрымалі па 10.145 кілаграмаў малака, пры гэтым гадавая прыбаўка склала па 805 кілаграмаў. У 2024 годзе па прадуктыўнасці дойнага статка калектыў заняў другое месца ў Брэсцкай вобласці з вынікам 11.716 кілаграмаў.

Работнікам СВК «Узыходзячая зара», а іх каля 300 чалавек, створаны ўсе ўмовы для працы і адпачынку. У складзе прадпрыемства не толькі малочнатаварныя, жывёлагадоўчыя фермы, свінагадоўчы і зернесушыльны комплексы, паляводчыя брыгады, транспартны парк, рамонтныя майстэрні, але і сталовая, дзіцячы сад, плавальны басейн, масажны і зубапратэзны кабінеты. Кааператыў дапамог пабудаваць у Хідрах, дзе пражывае больш за 800 чалавек, праваслаўны храм, узяўшы будаўніцтва на баланс вясной 2008 года. 25 лютага 2016 года храм асвяціў епіскап Брэсцкі і Кобрынскі Іаан. На ўрачыстасці Т. П. Дземідзюк за вялікі ўклад у будаўніцтва храма ўручаны ордэн прападобнай Еўфрасінні Полацкай.

Таццяна Паўлаўна вядзе вялікую грамадскую дзейнасць, абрана дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў XXVIII склікання (2022).

За час сваёй працы Т. П. Дземідзюк не раз удастойвалася ганаровых узнагарод і званняў. Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі» (2016), Ганаровымі граматамі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, Ганаровымі граматамі Брэсцкага аблвыканкама і Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, граматай Кобрынскага райвыканкама і інш. Пераможца абласнога конкурсу «Жанчына года – 2011» у намінацыі «За ўклад у развіццё вёскі».

Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 27 снежня 2024 года № 37 за выбітны асабісты ўклад у развіццё агraпрамысловага комплексу Кобрынскага раёна і грамадскую дзейнасць Т. П. Дземідзюк, старшыні сельскагаспадарчай вытворчасці кааператыва «Узыходзячая

зара», прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

Матэрыял падрыхтаваны ў 2026 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Елизарова, Ж.** (Не)женское дело / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2025. – 11 студзеня (№ 2). – С. 4 : фот.

По итогам 2024 года Татьяне Павловне Демидюк присвоено звание «Почетный гражданин Кобринского района».

**Елизарова, Ж.** Опыт руководителя – во благо отрасли / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2025. – 24 мая (№ 21). — С. 19 : фат.

На чествовании лучших руководителей в сфере агропромышленного комплекса по итогам работы за 2024 год председателю СПК «Восходящая заря» Татьяне Демидюк вручено Благодарственное письмо Брестского облисполкома.

**Курец, А.** На таких хозяевах земля держится / Александр Курец ; фот. Павла Богуша // Сельская газета. – 2025. – 11 февраля (№ 16). – С. 12 : фот.

Звание «Почетный гражданин Кобринского района» присвоено председателю местного СПК «Восходящая заря» Татьяне Демидюк.

**Елизарова, Ж**. Первые по молоку / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2024. — 4 мая (№ 18). — С. 7 : фот.

СПК "Восходящая заря" Кобринского района занесен на Республиканскую доску Почета победителей по итогам 2023 года в отрасли сельского хозяйства.

**О занесении** на Республиканскую доску Почета победителей соревнования за 2023 год // Кобрынскі веснік. - 2024. — 27 красавіка (№ 17). — С. 6.

Указом Президента Республики Беларусь № 174 СПК "Восходящая заря" Кобринского района занесен на Республиканскую доску Почета победителей соревнования за 2023 год среди организаций сельского и рыбного хозяйства.

**Яскевіч, С.** Першыя па малаку / Святлана Яскевіч ; фота Валерыя Караля // Звязда. – 2023. – 18 сакавіка (№ 52). – С. 3 : фат.

Аб ушанаванні перадавікоў вытворчасці малака ў гаспадарках Брэсцкай вобласці, сярод якіх старшыня СВК "Узыходзячая зара" Таццяна Дземідзюк.

**Яскевіч, С.** Сем тысяч – не мяжа / Святлана Яскевіч // Звязда. - 2023. - 30 снежня. - С. 4.

Аб рэкорднай вытворчасці малака сельскімі гаспадаркамі Брэсцкай вобласці; сярод перадавікоў СВК «Узыходзячая зара» (старшыня Т. Дземідзюк).

**Елизарова, Ж**. Весенние заботы "Восходящей зари" / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 21 красавіка. — С. 5.

СПК "Восходящая заря" входит в десятку лучших хозяйств республики.

**Павловский, Б.** Вверх по лестнице власти / Борис Павловский // Вечерний Брест. - 2018. — 7-9 марта. — С. 1.

Председатель СПК «Восходящая заря» Т. Демидюк возглавляет комиссию по развитию социально-культурной сферы и социальной защиты населения Брестского областного Совета депутатов.

**Вовк, Ю**. Освящение храма в Хидрах – путь длиною в 9 лет / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2016. - 3 марта. - С. 9.

25 февраля 2016 г. в Хидрах состоялось освящение Иоанно-Предтеченской церкви; Т. П. Демидюк награждена орденом преподобной Евфросинии Полоцкой.

**Неслабая** половина председательского корпуса // Сельская газета. - 2016. — 5 марта. — С. 1, 3 : фот.

Председатель СПК "Восходящая заря" Кобринского района Татьяна Демидюк - одна из приглашенных в г. Минск на предпраздничное чествование женщин-руководителей.

**Дземідзюк, Т**. "У гаспадаркі годная будучыня" / [Таццяна Дземідзюк ; гутарыў] Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2014. — 19 сакавіка. —С. 2.

**Лесік, І.** Узыходзячая зорка Кобрыншчыны / Ірына Лесік //Кобрынскі веснік.- 2014. – 3 снежня. – С. 1, 3.

Ужо пяць гадоў СВК "Узыходзячая зара"ўзначальвае былы эканаміст, ураджэнка в. Хідры Таццяна Дземідзюк.

**Мельнік, Р.** "Няма прывычкі часта глядзець на гадзіннік" / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. — 2014. — 19 ліпеня. — С. 9.

Аб дасягненнях СВК “Узыходзячая зара”, які ўзначальвае Таццяна Дземідзюк.

**Дземідзюк, Т.** «Родная зямля аддзякуе» / Таццяна Дземідзюк // Кобрынскі веснік. - 2012. - 21 ліпеня. - С. 9 : фат.

Таццяна Дземідзюк - старшыня СВК «Узыходзячая зара».

**Мельнік, Р.** Таццяна Дземідзюк: «І землі шчодрыя, калі людзі залатыя» / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2012. - 21 красавіка (№ 33). - С. 1, 2 ; фат.

Старшыня СВК «Узыходзячая зара» Таццяна Дземідзюк па выніках абласнога конкурсу была ўдастоена звання «Жанчына 2011 года» ў намінацыі «За ўклад у адраджэнне сяла».

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Хідры

***Установы:***

«Узыходзячая зара» СВК

***Імёны:***

Дземідзюк Таццяна Паўлаўна

***Прадметы:***

Ганаровыя грамадзяне

Старшыні